ПАМЯЦЬ СЭРЦА

У пятніцу, у Дзень Перамогі, у двары універсітэта сабралася каля пяці тысяч студэнтаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў на мітынг, прысвечаны закладцы помніка супрацоўнікам і студэнтам Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна, якія загінулі ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

Гучаць фанфары. Дынамікі даносяць песню Вялікай Айчыннай вайны «Вставай, страна огромная...».

Мітынг адкрывае сакратар парткома Т. Я. Дударава. Яна прадастаўляе слова рэктару універсітэта акадэміку АН БССР прафесару А. Н. Сеўчанку. Затым выступаюць былы лётчык, выкладчык кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі М. Я. Зайцаў, якому за шматлікія подзвігі на франтах у 21 год было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза, былы партызан, ардэнаносец, дацэнт кафедры гісторыі КПСС прыродазнаўчых факультэтаў А. У. Царук, студэнтка трэцяга курса юрфака Лена Кананоўіч. Яны гавораць аб неўміручым подзвігу савецкага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Мінутай маўчання прысутныя ўшаноўваюць памяць загінуўшых. Сакратар камітэта камсамола М. Д. Ціва чытае словы клятвы студэнтаў быць вернымі Радзіме, Камуністычнай партыі. Іх паўтараюць усе ўдзельнікі мітынгу. Шматтысячны калектыў заяўляе:

«Мы, унукі тых, хто штурмаваў Зімні, дзеці павергнуўшых рэйхстаг, ад імя нашага пакалення сэрцамі сваімі прысягаем на вернасць справе Леніна, справе партыі, справе Кастрычніка!

Партыя дала нам вечны агонь — ленінізм. З партыяй Леніна наш народ сарваў аковы рабства, з партыяй Леніна ён пабудаваў новы свет — Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік, з партыяй Леніна савецкі народ выратаваў чалавецтва ад фашысцкай чумы.

Рабочай праўдай, не зломленай кандаламі і катаргай, свабодай, паўстаўшай на барыкадах, крывёй, пралітай нашымі бацькамі, КЛЯНЁМСЯ, што вечна будзе ў нашых сэрцах агонь ленінізма, агонь барацьбы, агонь рэвалюцыі!

КЛЯНЁМСЯ!

Прымаючы тваю славу, Радзіма, мы будзем мацаваць і памнажаць тваю веліч, натхнёнай працай, кіпучай энергіяй маладосці ствараць будучыню.

Мужнасцю першых палатак, працоўнай гордасцю, камсамольскім гонарам КЛЯНЁМСЯ аддаць усе свае сілы для славы і магутнасці нашай Айчыны!

КЛЯНЁМСЯ!

Святасцю брацкіх магіл, сівізной нашых маці, радасцю перамогі КЛЯНЁМСЯ быць дастойнымі бессмяротнасці бацькоў і па першай трывозе пад авеянымі славай сцягамі пайсці ў бой і перамагчы!

КЛЯНЁМСЯ!

Памяццю камунараў і смуткам Піскарэўскага могільніку, маўчаннем Хірасімы і набатамі Хатыні, імем дружбы і салідарнасці КЛЯНЁМСЯ змагацца за справядлівую справу ўсіх працоўных!

КЛЯНЁМСЯ!

Маладосцю сваёй КЛЯНЁМСЯ быць вернымі справе камуністаў, ніколі не забываць тых, хто аддаў сваё жыццё за наша шчасце.

Наша пакаленне ніколі не зверне з ленінскага шляху! Кожным стукам сэрца, кожным пражытым днём, усім сваім жыццём КЛЯНЁМСЯ зацвярджаць на зямлі камунізм!

КЛЯНЁМСЯ!

З вуснаў бацькоў, з рук бацькоў мы прынялі «Інтэрнацыянал».

Мы і сёння у інтэрнацыянальных брыгадах!

Фашызм не пройдзе! Не — агрэсарам! Далоў каланізатараў! З «Інтэрнацыяналам» паўстане род людскі!

КЛЯНЁМСЯ! КЛЯНЁМСЯ! КЛЯНЁМСЯ!»

ПЕРАМОЖЦЫ ВЫЗНАЧАНЫ

Падведзены вынікі другога тура агляду-конкурсу факультэцкіх насценных газет універсітэта, які быў аб'яўлены ў мінулым годзе парткомам у сувязі з падрыхтоўкай да 50-годдзя БССР і КПБ і 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна.

Журы прысудзіла першае месца газеце біяфака «Віта». Другое месца раздзялілі «Журналіст» і «Філолаг», на трэцім — «Гісторык» і «За навуку» (фізфак). На чацвёртым месцы сценгазеты матэматычнага факультэта, на пятым — хімічнага, на шостым — геолага-геаграфічнага, на сёмым — юрыдычнага факультэтаў.

Рэдкалегіі газет, якія занялі прызавыя месцы, узнагароджваюцца граматамі рэктарата, парткома, камітэта камсамола, мясцкома і прафкома і грашовымі прэміямі.

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 17 (746) ✦ Пятніца, 16 мая 1969 г. Цана 2 кап. Год выдання XXII

Каля вучэбнага корпуса універсітэта ўкладваецца мармуравая пліта. На ёй надпіс: **«ТУТ БУДЗЕ ЎСТАНОЎЛЕН ПОМНІК СТУДЭНТАМ І ВЫКЛАДЧЫКАМ БЕЛДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА, ЗАГІНУЎШЫМ У ГАДЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ (1941—1945)».**

Пасля мітынгу калоны студэнтаў і выкладчыкаў накіраваліся ў Трасцянец, Масюкоўшчыну, дзе ўсклалі вянкі да помнікаў ахвяр фашызму. Вянкі і букеты жывых кветак былі ўскладзены ля падножжа помніка-абеліска воінам Савецкай Арміі, партызанам Беларусі, загінуўшым у баях за вызваленне нашай Радзімы ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Група студэнтаў выязджала таксама ў вёску Хатынь, дзе ўсклала вянкі да мемарыяльнага помніка.

НА ЗДЫМКАХ: закладка помніка выкладчыкам, супрацоўнікам і студэнтам Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна, загінуўшым у час Вялікай Айчыннай вайны (уверсе); мармуравая пліта на месцы будучага помніка (унізе); ля мемарыяльнага помніка ў Хатыні. Фота М. НЕЧЫПАРЭНКІ.

СУСТРЭЧА

З АЎТАРАМ КНІГ АБ ЛЕНІНЕ

Рыхтуючыся да 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна, кафедра рускай літаратуры БДУ імя У. І. Леніна, якую ўзначальвае прафесар Ф. І. Куляшоў, распрацавала і здзяйсняе цэлы рад мерапрыемстваў, прысвечаных гэтай знамянальнай даце.

Нядаўна на філалагічным факультэце універсітэта адбылося расшыранае пасяджэнне кафедры сумесна са студэнтамі і аспірантамі. Выкладчыкі і студэнты сустрэліся, каб абмеркаваць кнігі пісьменніка П. І. Ткачова аб Уладзіміру Ільічу Леніне — «Вішнёвая квецень» і «Сэрца камунара».

Пісьменнік П. І Ткачоў расказаў аб тым, як ён прыйшоў да работы над ленінскай тэмай, падзяліўся сваімі творчымі планамі на будучае.

Затым прысутныя выказалі свае ўражанні аб прачытаных кнігах. Дацэнт Л. Л. Кароткая адзначыла тую цікавасць, якую выклікаюць кнігі П. І. Ткачова аб Леніне нават у дарослага чытача, хоць яны напісаны ў асноўным для дзяцей, звярнула ўвагу на ўменне пісьменніка надаць добра знаёмым гістарычным падзеям жывыя фарбы.

Студэнтка Рэня Макавеева гаварыла аб цікавасці, з якой яна прачытала аповесць «Сэрца камунара», адзначыла яе вартасці і недахопы, сказала аб недастатковай, на яе думку, распрацоўцы вобраза Ільіча ў беларускай дзіцячай літаратуры.

Аб цудоўных ведах аўтарам псіхалогіі дзяцей, аб тонкім і тактоўным паказе вобраза Уладзіміра Ільіча, які клапоціцца аб маленькіх грамадзянах Савецкай краіны, гаварыла Аня Іванова.

Студэнтка Лаўнічук у сваё выступленне ўключыла ўрыўкі са зборніка апавяданняў «Вішнёвая квецень».

Другія выступаючыя студэнты расказвалі аб тэме Беларусі ў творах П. І. Ткачова, адзначалі тую карысць, якую прынясуць кнігі пісьменніка пра дзяцей ім, будучым настаўнікам.

Аспірант С. Чубакоў заўважыў уменне аўтара добра, натуральна спалучаць у сваіх творах дакладную дакументальную аснову з мастацкім вымыслам.

Дацэнт З. С. Мелкіх высока ацаніла кнігі П. І. Ткачова аб дзецях, адзначыла любоў пісьменніка да сваёй тэмы.

Пасля абмеркавання П. І. Ткачоў адказаў на пытанні прысутных.

У заключэнне загадчык кафедры Ф. І. Куляшоў выказаў агульнае ўражанне ад кніг П. І. Ткачова пра Ільіча, адзначыў дынамічнасць сюжэта аповесці «Сэрца камунара», сувязь гэтага твора са зборнікам апавяданняў «Вішнёвая квецень», пажадаў аўтару ад імя ўсіх прысутных новых творчых поспехаў.

Н. ПАПОВА,
аспірантка БДУ імя У. І. Леніна.

У бібліятэцы, перш чым выехаць на практыку ў маляўнічыя куткі Беларусі, таямніцы прыроды пачынаюць раскрывацца спачатку ў аўдыторыі, бібліятэцы, лабараторыі. На здымку вы бачыце бібліятэк-першакурснікаў на практычных занятках.

Фота **Я. Данілава.**

ДЫПЛОМНАЯ ПАРА

Яшчэ да майскіх свят на юрыдычным факультэце пачалася абарона дыпломных работ студэнтамі-завочнікамі. Многія з іх падрыхтавалі цікавыя і змястоўныя працы па актуальных праблемах прававых навук і юрыдычнай практыкі. Дзяржаўная камісія (старшыня— дацэнт, загадчык кафедры Інстытута народнай гаспадаркі Д. Ф. Ерамееў) высока ацаніла, напрыклад, дыпломную работу інструктара Ашмянскага райкома партыі А. С Бакарова на тэму «Удзел працоўных у ахове грамадскага парадку». Аўтар сабраў, прааналізаваў і абагульніў вялікі фактычны матэрыял па Гродзенскай вобласці аб дзейнасці пастаянных камісій сацыялістычнай законнасці і аховы грамадскага парадку, добраахвотных народных дружын, адміністрацыйных камісій і камісій па справах непаўналетніх. Прапановы студэнта па ўдасканаленню заканадаўства ў гэтым напрамку ўяўляюць несумненную цікавасць. Праект Савецкай Канстытуцыі, які распрацоўваецца ў сучасны момант, надае асаблівую актуальнасць тэме дыпломнай работы А. Я. Сячкова «Савецкая Канстытуцыя (паняцце, сутнасць, прынцып)». Яна, як і іншыя працы студэнтаў-завочнікаў, таксама паспяхова абаронена. Сёння эстафету завочнікаў перайманоць выпускнікі вячэрняга аддзялення.

Поўным ходам ідзе абарона дыпломных на факультэце журналістыкі, філалагічным і іншых. А вось завочнікі філасофскага аддзялення ўжо пераступілі гэты парог. Тут усе атрымалі станоўчыя адзнакі, значная колькасць прац ацэнена на выдатна і добра.

Трэба адзначыць, што абарона дыпломных работ выпускнікамі ідзе арганізавана, сведчыць аб добрай тэарэтычнай і метадычнай падрыхтоўцы студэнтаў.

А. КЛІМОВІЧ.

ЖЫВОЕ СЛОВА ІЛЬІЧА

...Гучыць жывы голас Ільіча. Слухаеш — і, здаецца, адчуваеш, як б'ецца ленінскае сэрца, яго жывая думка. У кожным слове — глыбокая вера ў справу працоўных, у перамогу.

Віталь Груздзеў каменціруе выступленне правадыра, а затым мы слухаем рэвалюцыйныя песні і музыку, якая натхняла байцоў ленінскай гвардыі.

Пад кіраўніцтвам куратара выкладчыка беларускай мовы А. І. Наркевіча ленінскія чытанні ў нас праводзяцца кожны панядзелак пасля лекцый. Студэнты вывучаюць багатую тэарэтычную спадчыну Ільіча, яго жыццёвы і рэвалюцыйны шлях.

Валя Прывалава расказала аб запаветах У. І. Леніна моладзі. Цікавыя даклады зрабілі Аня Александровіч, Лёня Кроцікаў і Таня Дзерах. Яны расказалі студэнтам аб знамянальных падзеях з біяграфіі Ільіча, аб тым, як змагаўся Ленін за стварэнне рабочага друку, аб увасабленні вобраза правадыра ў беларускай літаратуры і народнай творчасці.

Кожны дакладчык творча падыходзіць да распрацоўкі тэмы, стараецца адшукаць мала вядомую старонку са спадчыны Ільіча.

На прыкладзе жыцця і дзейнасці У. І. Леніна будучыя журналісты вучацца майстэрству і глыбокай палымянасці.

М. БАБОК,
студэнт II курса журфака.

З ДУМАЙ ПРА ЮБІЛЕЙ

З кожным днём усё менш часу застаецца да велічнага свята — 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна, і таму ўсё больш адчувальным становіцца ўклад нашага народа ў падрыхтоўку да гэтага юбілею.

Не застаюцца ў баку ад пачэсных спраў і супрацоўнікі нашай бібліятэкі. Яны, як і ўвесь калектыў нашага універсітэта, уключыліся ў сацыялістычнае спаборніцтва, прысвечанае ленінскаму юбілею, і ўзялі на сябе абавязацельствы яшчэ больш актыўна змагацца за камуністычныя адносіны да працы, шырока прапагандаваць творы Ільіча, а таксама матэрыялы з'ездаў і Пленумаў ЦК КПСС. Адной з форм прапаганды з'яўляюцца канферэнцыі чытачоў, якія даволі часта праводзяць супрацоўнікі бібліятэкі сумесна з кафедрамі грамадскіх навук, рускай савецкай літаратуры, партыйнымі бюро факультэтаў. Нядаўна прайшлі такія канферэнцыі на фізічным, матэматычным, геолага-геаграфічным факультэтах. Актыўны ўдзел у іх правядзенні і падрыхтоўцы прынялі выкладчыкі К. К. Герман, В. А. Баркан, А. М. Міхайлаў, Ф. Ф. Мухін, Н. П. Хрыпко, У. С. Карабан.

З вялікай ахвотай выступаюць па многіх пытаннях на канферэнцыях чытачоў студэнты. Асаблівую цікавасць выклікалі паведамленні А. Разанава, Н. Жалтухінай, О. Елеф, Л. Высокіх, Р. Сізавай, Я. Адамовіч, І. Гахавай, Ж. Малашэвіч, Н. Алейнікавай і іншых.

У будучым супрацоўнікамі бібліятэкі і кафедрамі гуманітарных і прыродазнаўчых навук запланавана правесці такія канферэнцыі па тэмах: «Ленінская тэорыя сацыялістычнай рэвалюцыі і сучаснасць», «У. І. Ленін і стварэнне сацыял-дэмакратычных арганізацый у Беларусі», «Вобраз У. І. Леніна ва ўспамінах родных», «У. І. Ленін і развіццё фізічнай навукі», «Вобраз Ільіча— прыклад для моладзі», «У. І. Ленін і А. М. Горкі», «У. І. Ленін і музыка» і многія-многія іншыя.

А. РУКШЫН,
супрацоўнік бібліятэкі.

ПАШЫРАЮЦЦА НАВУКОВЫЯ СУВЯЗІ

Нядаўна па ініцыятыве беларускіх вучоных адбылося сумеснае пасяджэнне калектываў кафедр дзяржаўнага права нашага універсітэта і Вільнюскага універсітэта імя В. Капсукаса. Яно было прысвечана тэме «У. І. Ленін аб нацыянальна-дзяржаўным будаўніцтве».

На пасяджэнні былі заслуханы і абмеркаваны даклады дацэнтаў Вільнюскага універсітэта А. Ю. Булоты «Некаторыя асаблівасці здзяйснення ленінскага кааператыўнага плана ў сельскай гаспадарцы Літоўскай ССР», С. П. Сачэкаса «У. І. Ленін аб прамысловай кааперацыі», а таксама дацэнтаў Белдзяржуніверсітэта А. Т. Лейзерава «У. І. Ленін аб гласнасці ў рабоце Саветаў» і С. Р. Віхарава «У. І. Ленін аб суверэнітэце Беларускай ССР». Усе выступленні былі высока ацэнены і выкліканы ажыўлены абмен думкамі.

Дасягнута дагаворанасць аб прадаўжэнні навуковага супрацоўніцтва юрыстаў двух універсітэтаў. Наступнае пасяджэнне адбудзецца ў Мінску і будзе прысвечана абмеркаванню актуальных праблем навукова-арганізацыйнай і вучэбна-метадычнай работы.

А. ЛЕЙЗЕРАЎ,
кандыдат юрыдычных навук.

БАЙЦЫ РЫХТУЮЦЦА ДА НАСТУПЛЕННЯ

Кожны дзень набліжае нас да ўдарнага працоўнага семестра, які камсамольцы універсітэта прысвячаюць 100-годдзю з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна. Закончыцца летняя сесія — і дзесяткі студэнцкіх атрадаў выедуць на будоўлі Беларусі, Казахстана, зоймуць рабочыя месцы на будаўнічых пляцоўках горада Мінска.

Штогод больш адной трэці будаўнічага атрада універсітэта складаюць студэнты фізічнага факультэта. Аб іх працоўных справах сведчаць памятныя сцягі, каштоўныя падарункі, ганаровыя граматы, якімі ўзнагароджан фізічны факультэт.

У працоўным семестры 1968 года будаўнічыя атрады фізфака асвоілі больш 550 тысяч рублёў капіталаўкладанняў. Адначасова камсамольцы праводзілі вялікую агітацыйна - прапагандысцкую работу.

У гэтым годзе задоўга да пачатку працоўнага лета штаб працоўных спраў факультэта прыступіў да фарміравання будаўнічых атрадаў. Зараз налічваецца 13 (кожны колькасцю каля 25 чалавек) будаўнічых атрадаў. Рабяты збіраюцца асвоіць больш 260 тысяч рублёў капіталаўкладанняў. У планах работ — будаўніцтва гаспадарчых памяшканняў і электрыфікацыя, мацаванне адкосаў каналаў.

Сярод камандзіраў і камісараў беларускіх атрадаў ёсць ужо выпрабаваныя байцы, такія, як намеснік начальніка штаба працоўных спраў фізфака Аляксандр Якубаў, Іван Ходан, і навічкі, якім упершыню камітэт камсамола і таварышы даверылі адказныя пасты.

Два будаўнічыя атрады фізічнага факультэта выедуць па будоўлі Казахстана. З саўгасамі Уральскай вобласці заключаны дагаворы на асваенне 250 тысяч рублёў. У казахстанскіх стэпах студэнты ўзвядуць новыя дамы, сельскагаспадарчыя пабудовы. І тут пабач з ветэранамі будуць працаваць навічкі. У чацвёрты раз паедзе на цаліну Клім Калінін, узнагароджаны ў мінулым годзе медалем «За асваенне цалінных і залежных зямель».

У трэці раз камандзірам атрада «Аэліта» едзе Вадзім Емяльяненкаў. Трэцім будзе цалінны семестр і для камісара другога атрада Івана Жалнярэвіча, Пятра Юрчанкі, Міхаіла Снегірова і іншых.

Камандзірам другога атрада зацверджан Мікалай Алтушэц, які ўзначальваў у 1968 годзе атрад на Лукомльскай ГРЭС.

Каля 150 студэнтаў летам будуць працаваць на будоўлях горада Мінска і БДУ. Яны ўнясуць свой важкі ўклад у добраўпарадкаванне сталіцы.

Зараз байцы беларускіх і цалінных атрадаў праходзяць медыцынскі агляд, слухаюць лекцыі па тэхніцы бяспекі, забяспечваюцца інструментамі і спецвопраткай. Летам кожны атрад павінен яшчэ выступаць з канцэртамі, лекцыямі перад мясцовымі жыхарамі, працаваць з дзецьмі ў піянерскім лагеры-спадарожніку. І таму вучацца камандзіры і лектары, камісары і артысты, байцы і піянерважатыя. Вучацца ў тых, хто ўжо ўдзельнічаў у працоўных семестрах, і ў масцітых лектараў. Вучацца, каб кожны атрад, які прадстаўляе фізічны факультэт, пачуў ад людзей: «Вялікае дзякуй».

НА ЗДЫМКУ: абмяркоўваюцца справы атрадныя. Злева направа: баец Віктар Красільнікаў, камандзір атрада «Аэліта» Вадзім Емяльяненкаў, камісар Юрый Макараў, начальнік штаба працоўных спраў фізфака Валерый Чудоўскі.

Фота **М. МАЗГУНОВА.**

В. ЧУДОЎСКІ,
начальнік штаба працоўных спраў фізфака.

САМЫ СВЕТЛЫ ТАЛЕНТ...

ПАРТРЭТЫ НАШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ

В. РАГОЙША, кандыдат філалагічных навук

У адным з вершаў народнага паэта БССР Максіма Танка ёсць радкі:

Прыемнасць —
Пазнаёміцца з чалавекам ветлым,
Радасць —
Пагутарыць з разумным,
Удача —
Знайсціся ў патрэбе са смелым.
Шчасце —
Жыць, працаваць
з чалавекам сумленным.

Не перачытваў нанава Максіма Танка, не вышукваў сумысля нейкіх паралеляў, а вось падумаў пра Алега Антонавіча Лойку — і радкі прыгадаліся самі сабой. Нібыта яму былі адрасаваны з самага пачатку, нібыта пра яго гэта напісана.

У сваіх адчуваннях — перакананы ў гэтым — я не адзін. Кожны, хто калі-небудзь сутыкаўся з Алегам Лойкам, перажываў хвіліны прыемныя і радасныя. Сапраўды, шчасце — жыць побач з ім, працаваць на адной кафедры, на адным факультэце.

Дацэнт кафедры беларускай літаратуры Алег Лойка — выхаванец нашага універсітэта. Сюды ён прыйшоў восенню 1948 года, каб пасля атрымаць дыплом выдатніка, скончыць аспірантуру, абараніць у тэрмін кандыдацкую дысертацыю, канчаткова звязаць свой лёс з родным «альма-матэр». Калі справядлівая думка, што асяроддзе фарміруе чалавека, то сёння мы павінны добрым словам згадаць і родны універсітэт, які не аднаму даў моцныя крылы для высокага лёту ў жыццё. А асяроддзе сапраўды было моцным, здаровым, надзейным. З аднаго інтэрнацкага пакоя «выйшлі ў людзі» сённяшнія вядомыя ў рэспубліцы майстры сваёй справы— вучоны-фізік, член-карэспандэнт АН БССР прафесар Л. В. Валадзько, вучоны-матэматык кандыдат фізіка-матэматычных навук дацэнт П. Т. Козел, пісьменнік, аўтар шырока вядомых аповесцей і апавяданняў Уладзімір Дамашэвіч. Менавіта з імі ў першую чаргу дзяліўся сваімі радасцямі і засмучэннямі студэнт Алег Лойка, менавіта яны дапамагалі яму паверыць у свае сілы, пераадолець пэўныя перашкоды, справіцца з няўдачамі.

Дапамога ж, добрая сяброўская парада патрэбны былі ў гады вучобы як ніколі: Алег Лойка пачаў пісаць вершы, друкавацца. Праўда, спрабаваў пісаць яшчэ да універсітэта, але сапраўднае ўступленне ў вялікую літаратуру адбылося толькі ў 1953 годзе, з публікацыі ў часопісе «Маладосць». Прыблізна ў гэты час выявіліся і яго здольнасці даследчыка літаратуры, вострага і праніклівага крытыка. Менавіта тады заўважыў студэнта-выпускніка вядомы беларускі літаратуразнаўца прафесар Юліян Сяргеевіч Пшыркоў, слова і парада якога дапамаглі Алегу Лойку выбраць свой, адзіна правільны, шлях у жыцці.

Так з тых пор і паяднаў лёс Алега Лойкі творчасць паэта з вымоглівай працай вучонага. У 1959 годзе выходзіць з друку яго першы зборнік вершаў «На юначым шляху», пасля кожныя два гады паэт дорыць чытачам па арыгінальнай кнізе: «Задуменныя пералескі» (1961), «Дарогі і летуценні» (963), «Блакітнае азерца» (1965), «Каб не плакалі кані» (1967). Сёлета ўбачыць свет новая кніга паэта — «Дзівасіл», моцная сваім філасофскім пачаткам, роздумам паэта над праблемамі рэчаіснасці, сутнасцю чалавечага жыцця. Па ўсіх гэтых кнігах можна выразна прасачыць ідэйна-творчы рост паэта Алега Лойкі ад нярэдкага сузіральніцтва, шчырага, непасрэднага, але падчас неглыбокага паказу рэчаіснасці да яе аналізу, выяўлення заканамернасцей жыцця, яго філасофскага асэнсавання. І раней паэту не чужымі былі думка, развага, роздум, але толькі цяпер думка становіцца па-наватарску смелай, развага—арыгінальнай, роздум — па-сталаму мудрым.

Паглыбленню даследчага пачатку паэзіі Алега Лойкі спрыяла і спрыяе яго крытычная і літаратуразнаўчая праца. Бо, сапраўды, што можа замяніць паэту карпатлівую вучобу ў класікаў роднай літаратуры, звязаную з уважлівым аналізам іх творчай спадчыны?! Дзе можна лепш адчуць асноўныя тэндэнцыі развіцця сучаснага літаратурнага працэсу, як не пры крытычным разглядзе паасобных кніг паэтаў-сучаснікаў?!

У той год, калі была надрукавана першая паэтычная кніга Алега Лойкі, пабачыла свет і яго першая літаратуразнаўчая праца — даследаванне «Адам Міцкевіч і беларуская літаратура». Праз два гады выходзіць манаграфія, прысвечаная аднаму з лепшых твораў славянскага свету — «Новая зямля» Якуба Коласа. Вытокі, веліч, харство». Даследчык упершыню здолеў паказаць гэты шырокі эпічны твор на фоне развіцця еўрапейскіх літаратур, вызначыць яго нацыянальныя вытокі, удакладніць і канкрэтызаваць ідэйную скіраванасць. Манаграфія атрымала цёплы водгук у крытыцы, высокую ацэнку ў перыядычным друку.

Алег Лойка працягвае займацца вывучэннем беларускай літаратуры XIX стагоддзя і яе сувязей з суседнімі славянскімі, у прыватнасці, з польскай [«Беларуска-польскія літаратурныя сувязі першай паловы XIX стагоддзя», брашура напісана ў сааўтарстве з Н. С. Перкіным), даследуе сённяшні дзень беларускай паэзіі («Паэзіі дзень сённяшні», 1968). Аднак з пэўнага часу ў яго з'яўляецца адна магістральная тэма: яго цікавяць праблемы развіцця беларускай літаратуры пачатку XX стагоддзя і творчасць Максіма Багдановіча. Зацікаўленасць тэмай выклікана перш за ўсё нераспрацаванасцю многіх праблем, няспелаcцю, а то і памылковасцю поглядаў на рэчы некаторых ранейшых даследчыкаў. Ды і палемічны запал сюды прычасціўся: гаворачы пра беларускую літаратуру пачатку нашага веку, многія літаратуразнаўцы, называючы Я. Купалу і Я. Коласа, чамусьці не хацелі заўважаць трэцяй вяршыні яе — Максіма Багдановіча. На аўтара «Вянка» вешаліся незаслужаныя дакоры, розныя ярлыкі. Урэшце, калі і гаварылі пра яго як пра класіка літаратуры, то гаварылі неяк быццам саромеючыся, робячы непатрэбную скідку. І гэта ў той час, калі ўкраінцы, напрыклад, цапкам самастойна і аб'ектыўна ацаніўшы ўклад М. Багдановіча ў паэзію, падрыхтавалі і выдалі томік яго выбраных вершаў у серыі «Жамчужыны сусветнай лірыкі» побач з творамі Шэкспіра, Амара Хайяма, Лермантава і іншых валатаў мастацкага слова.

З глыбокіх назіранняў, навуковых пошукаў, здагадак, доказаў, аргументаў, з самога палемічнага пафасу выросла неўзабаве цікавая і арыгінальная праца. Увасобілася яна ў дзесятках паасобных часопісных і газетных публікацый, у вялікай манаграфіі «Максім Багдановіч» (1966), нарэшце — у грунтоўнай доктарскай дысертацыі, якую Алег Лойка павінен днямі абараняць на пасяджэнні вучонага савета універсітэта.

Часам падумаецца: як можа адзін чалавек справіцца з такім аб'ёмам працы — і вучэбнай, і навуковай, і пісьменніцкай! А ён спраўляецца. Ды гэта яшчэ не ўсё: выкладчык-камуніст Алег Антонавіч Лойка выконвае вялікую грамадскую работу. Яго лекцыі неаднаразова слухалі рабочыя падшэфнага аўтазавода, ён часта выступае на розных літаратурных вечарах, у школах і на прадпрыемствах рэспублікі. Пэўны час Алег Лойка быў рэдактарам «Беларускага універсітэта». Цяпер яго галоўны клопат — універсітэцкае літаб'яднанне «Узлёт». Узлётаўцы ўжо выдалі некалькі паэтычных кніг, іх творы ведаюць не толькі ў рэспубліцы, але і за яе межамі. Узлётаўцы — арганізатары цікавых літаратурных вечароў, сустрэч з пісьменнікамі. У іх творчай і арганізацыйнай актыўнасці вялікая заслуга кіраўніка «Узлёту» Алега Лойкі. Ён не толькі скіроўвае творчыя пошукі маладых паэтаў і празаікаў, дзеліцца з імі сваім пісьменніцкім вопытам, але і выхоўвае іх у духу савецкага патрыятызму і інтэрнацыяналізму, самаадданага служэння роднай краіне і народу. Верыцца: многія з узлётаўцаў вырастуць у сапраўдных, буйных літаратараў. І я перакананы, што не раз яны добрым словам успомняць свайго першага літаратурнага дарадчыка.

...Пачаўшы з вершаў, хочацца імі і закончыць:

Усё праходзіць, быццам дождж няроўны:
І боль, і злосць, і дробная брыда;
А застаецца важны і галоўны
І самы светлы талент — дабрата.

Чытаю гэтыя радкі Сяргея Грахоўскага, а перад вачыма зноў паўстае крыху сарамяжлівы, адкрыты твар Алега Антонавіча Лойкі, чуюцца яго словы: «Жыццё назаўсёды пакінула ва мне чуласць да чалавека, нават боязь, каб не пакрыўдзіць каго-небудзь чым-небудзь».

Прыемна, радасна, шчасна жыць і працаваць побач з такім чалавекам!

Разам з усімі студэнтамі універсітэта старанна рыхтуюцца да вясенняй сесіі і навучэнцы падрыхтоўчага факультэта.

На здымку нашага фотакарэспандэнта Я. ДАНІЛАВА вы бачыце в'етнамскіх студэнтаў у час лабараторнай работы па фізіцы.

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

НАШ КЛОПАТ

Працоўная ініцыятыва камуністаў факультэта журналістыкі, які нядаўна адсвяткаваў свой 25-гадовы юбілей, у сучасны момант выклікана набліжэннем 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна. Падрыхтоўка да гэтага свята на нашым факультэце мае свае спецыфічныя асаблівасці. Гэта тлумачыцца перш за ўсё тым, што факультэт журналістыкі — партыйны факультэт, які рыхтуе работнікаў прэсы, радыё і тэлебачання. Таму ў аснове ўсяго навучальнага працэсу ляжыць неперайзыйдзеная па сваёй абгрунтаванасці, навуковай каштоўнасці і журналісцкай таленавітасці ленінская літаратурная спадчына. Партыйная арганізацыя імкнецца накіраваць актыўнасць калектыву факультэта на ўсебаковае паляпшэнне працэсу вучобы.

Яшчэ ў пачатку года партбюро звярнула ўвагу на правільную расстаноўку сіл. Гэта знайшло свой адбітак у тым, што многія камуністы былі пасланы ў камсамольскую арганізацыю. Павысілася актыўнасць саміх камуністаў, аб чым не раз гаварылася на партыйных сходах факультэта. Гэта адразу дало нядрэнныя вынікі. Апрача кантролю за вучобай асобных студэнтаў, камуністы многае зрабілі па паляпшэнню дысцыпліны на занятках. Яны павялі рашучую барацьбу і з пропускамі лекцый. Нястомнымі і да канца прынцыповымі ў гэтай справе паказалі сябе камуністы М. І. Сілуянаў, А. І. Раковіч, У. Маляўскі, Ф. Сагановіч і іншыя.

Партыйная арганізацыя лічыць сваім абавязкам заўсёды працаваць разам з камсамольцамі. Актыўнасць факультэцкага камсамола вялікая. Аб гэтым сведчыць яе плённы ўдзел ва ўсіх універсітэцкіх, а таксама факультэцкіх мерапрыемствах, пачынаючы ад вечароў-агеньчыкаў, традыцыйнага медыуму і да паездак у падшэфную вёску або агітацыйных лыжных паходаў. Камуністы Р. В. Булацкі, А. Е. Жураў, М. С. Зярніцкі, М. Я. Куцэнка, С. Сас, Г. Сыраежка, Л. Галаўня пастаянна аказваюць дапамогу камітэту камсамола і яго сакратару Васілю Гурыну.

З бескарыснай адданасцю і энергіяй дапамагаюць у арганізацыі факультэцкага самадзейнага мастацтва дацэнт Я. Л. Бондарава, камсамольцы Скварчэўскі, Ільюшэнка, камуністы Говін, Баравы, Аўчарэнка і іншыя.

Гэта толькі некалькі штрыхоў вялікай працы камуністаў факультэта. Яшчэ патрэбна было б сказаць аб удзеле камуністаў-студэнтаў і выкладчыкаў у навуковых канферэнцыях, прысвечаных У. І. Леніну, аб тэматыцы дыпломных і курсавых работ, дзе прадугледжана вывучэнне публіцыстыкі Ільіча, аб ленінскіх чытаннях і палітінфармацыях.

Асаблівай увагай партыйнай арганізацыі карыстаецца факультэцкі насценны друк. У пяці насценных газетах шырока адлюстроўваецца студэнцкае жыццё, змешчана шмат вершаў, нарысаў, артыкулаў на розныя тэмы. Справе насценнага друку аддаюць свой вольны час камсамольцы Тулбусаў, Кавалік, Патыка, Шур, Кацнельсон, Трусаў, камуністы Петэрсон, Сачанка і іншыя.

Набліжаецца вясенняя сесія. Наколькі паспяхова мы вытрымаем яе — такой адзнакай будуць ацэнены і ўсе нашы намаганні за год працы. Для паспяховай здачы залікаў і экзаменаў у нас ёсць усе магчымасці. Аб гэтым сведчаць вынікі зімовай сесіі. Вясной мы павінны пазбавіцца апошніх хібаў у нашай працы. Тады кожны камуніст можа з поўным правам лічыць свой абавязак выкананым.

А. СЛУКА,
сакратар партбюро журфака.

ЖАДАНАЯ ГОСЦЯ

МЫ ПАЗНАЁМІЛІСЯ з ёю ў інтэрнаце. Анфіса Сямёнаўна Стафеева прынесла тады білеты ў тэатр, і яе запрасілі да сябе нашы суседзі. Хтосьці з хлопцаў сказаў: «Аб «Альпійскай балладзе» думкі самыя супярэчлівыя. Таму я ніяк не набяруся смеласці паглядзець спектакль. Баюся расчаравацца. Ілюстрацыя аповесці Быкава ў форме танца, на мой погляд, не можа перадаць тэму мужнасці, інтэрнацыянальную сутнасць і рамантычную ўзнёсласць. А менавіта гэта хвалюе мяне».

Яна ўважліва выслухала, абвяла ўсіх нас дапытлівым позіркам і пачала гаварыць. Гутарка была доўгай. «Мне думаецца, — гаварыла яна, — удала знойдзена мова і кампазіцыя танца. Знаходкі кампазітара Е. Глебава і балетмайстра цікавыя, арыгінальныя, і толькі таму спектакль хвалюе, выклікае роздум».

А потым аналізавалі «Мечту», «Евгения Онегина», «Октябрь», «Отелло». Многа спрачаліся, дзяліліся думкамі, выказвалі пажаданні. Невялікі пакой ператварыўся ў цесную аўдыторыю, у якой размяшчаліся хто як мог... Анфіса Сямёнаўна пазнаёміла нас з перспектыўнымі планамі тэатра, расказала аб артыстах Бухарэсцкага балета, якія прыехалі да нас на гастролі.

Мяне здзіўляе шырыня інтарэсаў гэтай жанчыны, эрудыцыя, неспакой.

— Яе талент раскрываецца буквальна ва ўсім: і ў вершах, напісаных для дзяцей, і ў арганізаваных ёю канцэртах, і ў паўсядзённай рабоце, — так адзываюцца аб Анфісе Сямёнаўне таварышы па рабоце. І не выпадкова таму А. С. Стафеева выбіралася членам жаночага савета ў нашым горадзе, членам бацькоўскага камітэта і педсавета школы, дзе вучыцца яе сын; узнагароджана граматамі розных грамадскіх арганізацый. «Але не ў гэтым справа, — гаворыць яна аб сабе.—Звычайная работа. Прыемна, што студэнты універсітэта па-сапраўднаму сустракаюць «тэатральную вясну». Толькі за сакавік месяц тэатр оперы і балета наведала 1.500 чалавек — гэта добра. Ды і як можна жыць без тэатра...»

Сёння, калі я глядзеў на сцэну, убачыў непрыкметную яе працу. І ўпэўнен, што ў поспеху артыста ёсць і яе часцінка, часцінка, у якую ўкладзена паэзія душы, вернасць сваёй справе.

П. БОНДАР,
студэнт.

УНІВЕРСІЯДА ДРУЖБЫ

У дні святкавання 99-й гадавіны з дня нараджэння У. І. Леніна ў Харкаве адбыўся фестываль студэнцкага мастацтва. Мясцовы універсітэт запрасіў на яго калектывы мастацкай самадзейнасці ўсіх універсітэтаў. Усе далі згоду, але прыехаць змаглі толькі прадстаўнікі чатырнаццаці калектываў. Гэта быў цікавы форум студэнцтва, у якім прынялі ўдзел не толькі аматары мастацтва, але і актыўныя члены студэнцкіх навуковых таварыстваў, спартсмены.

ПЕРАМАГЛО СЯБРОЎСТВА

Прайшло ўжо больш двух тыдняў пасля заканчэння фестывалю дружбы універсітэтаў Савецкага Саюза ў Харкаве, але паранейшаму свежымі застаюцца карціны сустрэч, экскурсій на заводы, па гораду.

Дэлегацыя нашага універсітэта пасля гаспадароў была самай прадстаўнічай. У яе склад уваходзілі народны ансамбль танца «Крыжачок», жаночая каманда па мастацкай гімнастыцы і студэнты-гісторыкі з навуковымі дакладамі. Так як журы фестывалю звярнулася з просьбай прадставіць на агляд нацыянальнае мастацтва, то натуральна, што многія універсітэты паслалі ў Харкаў народныя і эстрадныя аркестры, народныя ансамблі танца. Нашаму «Крыжачку» прыйшлося спаборнічаць з дастойнымі сапернікамі. І ўсё ж прыемна адзначыць, што па разнастайнасці праграмы, высокаму выканаўчаму майстэрству ансамбль выглядаў лепшым сярод усіх калектываў. Вялікая заслуга ў гэтым яго мастацкага кіраўніка і пастаноўшчыка Мікалая Вікенцьевіча Лапшы. За кароткі тэрмін ён стварыў дружны, працаздольны калектыў, якому заслужана было прысвоена званне народнага.

Праграма студэнцкіх выступленняў была насычанай і напружанай: 18 сакавіка — адборачныя канцэрты ў актавай зале Харкаўскага універсітэта, прычым тут выступалі ўсе самыя моцныя калектывы, у тым ліку Ленінградскага, Тартускага, Харкаўскага, а таксама нашага універсітэтаў. У выніку былі адабраны лепшыя нумары для заключнага канцэрта, які адбыўся праз дзень у той жа зале Харкаўскага універсітэта. Адзіны з усіх калектываў—наш ансамбль — атрымаў права на два нумары ў заключным выступленні—гэта беларускі народны танец «Крыжачок» (пастаноўка М. В. Лапшы) і «Мінскі вальс» у выкананні салістаў ансамбля Л. Грышчанкі і У. Дудко.

Да заключнага канцэрта, 19 красавіка, у вялікай канцэртнай зале кінатэатра «Украіна» адбыўся зводны канцэрт універсітэтаў краіны. Таджыкскія танцы змяняліся казахскімі, грузінскія і армянскія матывы следавалі за ўкраінскімі песнямі, і аўдыторыя ажыўлялася, калі выходзілі нашы танцоры. Радаснай была вестка, што навуковая праца нашага студэнта-гісторыка ўключана ў лік трох лепшых работ, заслуханых на фестывалі, а каманда па мастацкай гімнастыцы заняла чацвёртае месца.

Праходзіў напружаны дзень, а вечарам пачыналіся сустрэчы розных універсітэтаў, розных нацыянальнасцей. Задушэўным гутаркам, цудоўным песням і танцам, здавалася, не будзе канца. Іншы раз яны зацягваліся да ўсходу сонца. Незабыўнымі застануцца экскурсіі па Харкаву, паездкі на заводы і фабрыкі, мінеральныя крыніцы. 20 красавіка быў аб'яўлены нядзельнік. Дэлегацыі ўсіх універсітэтаў краіны прынялі ў ім удзел, пасадзілі алею дружбы. Хто выйшаў пераможцам на фестывалі? Па аднадушнаму рашэнню журы, перамагла дружба. Гэта сапраўды так.

В. ЛІТВІНКА,
кіраўнік дэлегацыі Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна.

ДЛЯ ХВАЛЯВАННЯЎ БЫЛІ ПРЫЧЫНЫ

Харкаў — буйнейшы прамысловы цэнтр, вядомы цэнтр навукі і культуры—сустрэў нас цёплым вясенніім сонцам. Да гэтага ішлі дажджы, і харкаўчане жартавалі, што, дзякуючы гасцям, устанавілася цудоўнае надвор'е. Што ж, мы згадзіліся з гэтым і стараліся ўзбагаціць добры настрой арганізатараў універсіяды.

У першы дзень даведаліся, што на гэтыя своеасаблівыя спаборніцтвы прыехаў народны ансамбль танца Чарнавіцкага універсітэта, моцны калектыў з Ужгарада, вядомыя студэнцкія майстры сцэны з Закаўказзя і іншых рэспублік краіны. Ды і гаспадары падрыхтаваліся вельмі добра.

Прыйшлося напружыць усе сілы, сканцэнтраваць сваю волю, каб заваяваць сімпатыі гледачоў і строгага журы да беларускіх танцаў. І вось мы на сцэне. Зала цёпла ўспрымае беларускі народны танец «Крыжачок», гледачы ад душы апладзіруюць вясёламу ўкраінскаму танцу. Добра была пастаўлена і харэаграфічная кампазіцыя «Камсамольцы 20-х гадоў». Нас павіншавалі з поспехам, і мы сталі ўжо гледачамі. Добра выступілі ўкраінскія калектывы, і спрэчку павінна было вырашыць журы.

А вечарам — сустрэча з сябрамі розных гарадоў. Расказам аб Мінску і Ужгарадзе, Кіеве і Брэсце не было канца. Не было канца і танцам. Закарпатцы развучвалі наш «Крыжачок», а мы іх «Трапацянку». На наступны дзень быў дадзены вялікі канцэрт у цудоўнай зале кінатэатра «Украіна». Выдатна выступілі нашы рабяты перад працоўнымі горада.

На заключным канцэрце былі аб'яўлены вынікі конкурсу. Журы не прысудзіла першых месц, але сярод танцавальных калектываў вылучыла народны ансамбль танца «Крыжачок» Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна і ўзнагародзіла яго ганаровым дыпломам.

Развітанне было цёплым. На памяць аб сабе мы пакінулі свае танцы, а нам аб універсітэце будуць нагадваць шматлікія сувеніры, незабыўныя сустрэчы з сябрамі.

У. ДУДКО,
студэнт трэцяга курса гістфака.

На здымках: (зверху ўніз) ва ўрачыстай калоне крочыць дэлегацыя Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна; хлебам-соллю віталі гасцінныя гаспадары-харкаўчане студэнтаў розных вну; на нядзельніку ў закладцы алеі дружбы прынялі ўдзел і нашы прадстаўнікі; (унізе злева) выконваюцца літоўскія і в'етнамскія танцы.

Фота М. НЕЧЫПАРЭНКІ.

Адказны рэдактар М. І. ІОСЬКА.

АТ 08681 Адрас рэдакцыі: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106 Т-22-07-19. Друкарня выдавецтва «Звязда». Тыраж 2000 экз. Зак. № 725.